Тураў і толькі Тураў

На "птушыны" фестываль-2010 на Тураўскім балонні "зляцеліся" аматары птушак з розных куточкаў Беларусі.

Збіраючыся ў Тураў на фестываль птушак, я расказала пра яго сваім сябрам. "Які-які фестываль? — перапытваў кожны. "Фестываль кулікоў!" — зноў і зноў цярпліва адказвала я і разумела: свята насамрэч вельмі новае і для слыху далёкіх ад аховы прыроды людзей зусім нязвыклае. Тым часам для заолага-арніталагічнай суполкі нашай краіны і іншых аматараў прыроды гэты фестываль ужо не толькі звыклы, але і доўгачаканы. Бо другі раз запар яго гасцінна прымае старажытны палескі горад Тураў — маленькая кропачка на карце, але самы важны птушыны горад Беларусі.

Галоўныя героі — кулікі.

Менавіта тут, ля самай мяжы Турава ды ледзь не ў самім горадзе знаходзіцца і знакамітае Тураўскае балонне — тэрыторыя, важная для птушак (ТВП) міжнароднай значнасці, якая некалькі гадоў таму стала піянерам у ахове адкрытых лугоў Беларусі.

Паколькі галоўнымі насельнікамі Тураўскага балоння з'яўляюцца шматлікія кулікі, то, безумоўна, яны і сталі галоўнымі дзеючымі асобамі птушынага свята. Гэта найбольш пра іх гаварылі са святочнай сцэны, гэта іх выявы можна было ўбачыць у Тураве нават у вітрынах крамаў. І менавіта прадстаўніцы кулікоў — сімпатычнай і танклявай марадунцы — тут у мінулым годзе быў адкрыты помнік, дарэчы, адзіны ў свеце. Птушачка адразу стала мякцовай славутасцю: побач з унікальным помнікам з задавальненнем фатаграфуецца і дзятва і дарослыя.

Што да сапраўдных кулікоў, то ў Тураве яны зусім побач. Тую самую маралунку, якая, між іншым, практычна нідзе ў Беларусі больш не сустракаецца, можна ўгледзець у бінокль альбо падзорную трубу адразу на пірсе, з якога пачынаецца Тураўскае балонне. Тут, на пірсе, спецыяльна да свята быў усталяваны і ахоўны знак міжнароднай сістэмы ТВП. Марадунка — вялікая рэдкасці і ў нас, і тым больш у Еўропе, а лугі па-над Прыпяццю -асноўныя месцы яе пражывання ў Беларусі. А гэта значыць, што на Тураўскае балонне ўскладзена вялікая адказнастіь за захаванне агульнанацыянальнай папуляцыі рэдкай птуткі. Паназіраць за паводзінамі жывога рарытэту з мастка ў цэнтры горада — ці ж гэта не ўдача? А для сапраўднага аматара птушак — проста асалода!

Сказана — зроблена.

Тураўскае балонне — не толькі ТВП, з 2008 года луг з'яўляецца таксама біялагічным заказнікам. Паводле навуковых звестак, гэта адно з найбольш важнык месцаў гнездавання і прыпынку ў час міграцыі больш як 50 відаў водна-балотных птушак. Таму для адказных за стан балоння людзей фестывальны ранак пачаўся З сур'ёзнай працы - навукова-практычнага семінара, прысвечанага адкрытым пойменным лугам і іх ролі ў падтрымцы біялагічнай разнастайнасці.

Часам гарачая, але канструктыўная гаворка тычылася ў асноўным вынікаў і перспектыў прыродаахоўнай дзейнасці на прыпяцкіх лугах. І, як высвятлілася, у мясцовай вертыкалі слова са справай ідзе праваруч: літаральна на наступны дзень у вёсцы Запясочча была адкрыта дамба, якая дапаможа захаванню прыроды Жыткавіцкага раёна. Мясцовыя ўлады вырашылі прымерканаць гэтую падзею якраз да птушынага фестывалю, а сам фестываль, дарачы, фамадская арганізацыя "Ахова птушак Бацькаўшчыны" прысвяціла Міжнароднаму году біяразнастайнасці.

Свята — для птушак і людзей

Пакуль дарослыя вырашалі "сусветныя" праблемы, на Чырвонай плошчы Турава ўжо завіравала дзіцяча-птушынае свята. Прынамсі, так здавалася, бо паўсюль снавала дзятва — як мясцовая, так і прыезджая. Ціхі Тураў даўно не бачыў такога "птушынага базару"!

У гэты дзень, да радасці маленькіх тураўчан, іх бацькоў, бабуль і дзядуляў, на кірмашовым плацы было ўсё: і тэатральная пастаноўка, і конкурсы, і гульні, і выставы, і танцы-скокі, і майстар-класы, і самы сапраўдны кірмаш. Тут можна было навучыцца ляпіць птушак з гліны, плесці з саломкі, рабіць са шкла і маляваць. Выстава "Майстэрня куліка" знаёміла гледачоў з творчасцю юных жыхароў Турава, а выстава насценных газет — з тым, што думаюць беларускія дзеці пра пералётных птушак. Лепшыя насценныя газеты, прысвечаныя міграцыі кулікоў у Сенегал, пасля фестывалю "паляцелі" ў Афрыку.

Мадэлі адзення, створаныя спецыялына для конкурсу-дэфіле "Кулічыная мода" юнымі дызайнерамі Турава і мадэльерамі міжнароднай творчай майстэрні "Млын моды", паказалі творчы погляд дзяцей на жыццё розных птушак. Шоу тураўскіх прыгажунь прыйшлося да душы і малым, і старым, нават дзядулькі-палешукі ў "глядзельнай зале" без шкадавання пляскалі ў свае спрацаваныя далоні!

А як кранальна прагучалі ў выкананні палескіх артыстаў беларускія народныя песні пра птушак — гэта трэба было чуць! Фальклорныя калектывы "Спасаўка" і "Абібок", "Вянок" і "Рарох" здзівілі як выразнасцю, пранікнёнасцю выканання, так і выдатна падабраным рэпертуарам. "Ой ці чуў ты, арач, аб маей радзіме?" - пыталіся ў гледачоў спявачкі з вёскі Чэрнічы, што каля Турава. І маленькі "арол" — сімпатычны палешучок — счвярджальна ківаў разумнай русай галоўкай, "лётаючы" па сцэне...

"І кружыцца бусел над роднаю хатай..."

Невядома, як "арол", але вось тураўскі бусел дакладна ведае, што такое радзіма. Бо штодзень кружляе "над радною хатай", над шырока разлітай Прыпяццю і над тураўскай плошчай. Так-так, у цэнтры колішняй сталіцы Тураўскага княства, якраз ля будынка гарсавета, зараз жынуць аж дзве пары буслоў. Адзін з іх доўга лётаў пад святочна ўбранай сцэнай, быццам бы вітаючы ўсіх тых, хто прыйшоў і прыехаў у Тураў, каб зноў спрычыніцца да жыцця птушак, іх аховы і вывучэння, зноў аддаць даніну свасй любові крылатым вестунам вясны.

...Залаты вясновы дзень на беразе Прыпяці ад ранку і да самага вечара купаў у сваіх цёплых промнях гасцей птушынага свята. І, здавалася, тут сапраўды было ўтульна — і людзям, і птушкам.

Святлана Адамовіч

Источник: Родная прырода.-2010.-№5.-С.12-13.